№ 9 (38) Пятніца, 25-га сакавіка 1927 г. м. Вільня Год II.

# БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіц… Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае … торыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакратыз… ізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.



Падпісная цана на 1 месяц …
„ „ „ 3 „ …
Заграніцу ўдвая дара…

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Ludwisarska 5 m 2.
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

# КАРА.

Шанхай паў! Чырвоныя кітайскія атрады вядуць ужо атакі на эўрапэйскія калёніі, якія кулямётамі абараняюць жаўнеры англійцаў, французаў і іншых эўрапэйцаў, як роўным чынам і амэрыканцаў. Аднак-жа ці можа быць сумліву ў тым, што гэтая тэрыторыя эўрапэйскіх канцэсіяў будзе занята кантонскім войскам? Быў момант, калі ў 1900 годзе 400 мільённы Кітай, падчас першай успышкі проціў „чужаземных д'яблаў", падпарадкаваўся маленечкім атрадам эўрапэйцаў і японцаў.

Сяньня, толькі праз 27 гадоў, мы бачым зусім іншае. Аўтарытэт свой вялікая Эўропа страціла на Далёкім Усходзе. Апрача бязьсільля Эўропы пасьля сусьветнай вайны, апрача безумоўнага нацыянальнага прабуджэньня Кітаю, на ўпадак гэтага аўтарытэта мела ўплыў адсутнасьць салідарнасьці эўрапэйскіх дзяржаваў паміж сабою, а самае глаўнае гэта адкрытая здрада Эўропе з боку Савецкай Расеі і актыўная, надзвычай спрытная, дапамога бальшавікамі чырвоным кітайскім арміям. Дні арміі Чан-Со-Л на палічаны, бо проціў яго кантонская армія ўжывае два сьмяротных аружжа: яскравы нацыяналізм пад лёзунгам поўнага вызваленьня Кітаю ад уплываў Эўропы, Амэрыкі і Японіі і ненавісьць да эўрапэйцаў, а перадусім да англічанаў. Сувязь з англійцамі разложыць і пагубіць яшчэ сяньня магутную армію Чан-Со Ліна. І мы лічым, што гэта будзе не перамогай Кітаю, як гэтакага, а гэта будзе страшэнны ўдар па цэлым сьвеце, а перадусім па Эўропе, з боку Савецкай Расеі.

Калісь, падчас вялікай вайны, калі змучаная расейская армія пачала, пад уплывам бальшавіцкай агітацыі, разваліваецца, салдаты цэнтральнай Расеі пакідаючыя фронт казалі: „што мне да гэтай вайны, да нашых, калужскіх—немец ня дойдзе"!

Зусім ідэнтычна паступалі эўрапэйцы, калі белыя арміі, выступіўшыя на барацьбу не толькі за сваю Бацькаўшчыну, але і за агульна-эўрапэйскую культуру і агульналюдзкія цэннасьці, зварачваліся з крыкам аб дапамозе да Эўропы. Эўропа эгаістычна казала: „да нас бальшавікі не дайдуць! Комунізм гэта спэцыфічна расейскае, варварскае зьявішча". Шмат прыкрых фактаў потым памсьцілася на гэтай жорсткай індэфэрэнтнасьці Эўропы ў адносінах да стогнучых, пад уладай комуністаў народаў Расеі. Гэтак жа жорсткай была Эўропа на крыкі аб дапамозе і справядлівасьці, з якімі зьвярталіся да яе новапаўстаўшыя народы Грузія, Украіна, Беларусь. Ніводнага слова пратэсту не пачулася ў абароне гэтых народаў з боку Эўропы, якая за тое гатавалася „гандляваць з людаедамі". Першую, самую гнюсную ролю ў гэтым гандлю з людаедамі гуляла Англія. Яна першая і была пакарана! Нядаўняя забастоўка вугальных работнікаў, а сяньня крах англійскага аўтарытэту і незабаўная ўтрата канцэсіяў на далёкім Усходзе, нанясуць сьмяротны ўдар магутнасьці Англіі.

Аказалася, што комунізм, калі не ўзарваў Англію (хаця і моцна падарваў) знутры, дык нанёс ёй страшэнны ўдар у яе самае балючае мейсца—ў яе калёніі. А ці трэба згадываць, што зараз жа за *першым* паражэньнем Англіі ў яе калёніях у Кітае, прыдуць другія паражэньні ў іншых калёніях, а перадусім у Індыі?

Мы зусім ня думаем бараніць Англію, альбо спачуваць ёй. Наадварот—бачучы як гордая, жорсткая і эгаістычная Англія нарэшце пакарана за гэтую жорсткасьць і бязсэрдэчнасьць міма волі чуем пэўнае задаваленьне. Так ёй і трэба! Але падзеі ў Шанхаі павінны нарэшце адчыніць вочы ўсей Эўропе на тую небясьпеку, якая пагражае ўсяму сьвету. Комуністычная зараза, апанаваўшая жалезнымі ціскамі б. Расею, выявіла цэлы сьвет з палітычнай і гаспадарчай раўнавагі. Калі Эўропа і Амэрыка страцяць раптам калёніі, а на колёсальных абшарах Кітаю і Манджуры пад ўплывам бальшавіцкай агітацыі разгуляецца 400-мільённая дзікая маса—усяму сьвету пагражае небясьпека, якую нават акрэсьліць цяпераka ня можна. Аднак жа нам здаецца, што як Англія так і ўся Эўропа гэта разумеюць. Яны толькі спазьніліся, каб не дапусьціць бальшавіцкай заразы на Далёкі Усход. Яны лёгкадумна не дацэнілі сілы 3-га Інтэрнацыяналу.

Падзеі ў Італіі, якая радыкальна ачысьцілася ад комуністычных элемэнтаў, перамога ўва ўсей Эўропе групаў антыкомуністычных над групамі і партыямі комуністычнымі альбо сацыялістычнымі паказвае, што нацыянальна-буржуазная Эўропа горнецца да рашучай барацьбы з інтэрнацыянальна-комуністычнымі сіламі як унутры сябе, так перад усім з Савецкай Расеяй. Рашучая і цьвёрдая урадовая лінія ў адносінах да нашых унутраных бальшавікоў павінна гэтак жа прайсьці да поўнага ачышчэньня Польшчы. Гэта ёй абсолютна неабходна, як авангарду антыкомуністычнай Эўропы, проці комуністычнага Усходу. Першым жа варункам поўнай ліквідацыі комуністычных уплываў ёсьць хутчэйшае правядзеньне у Польшчы рэформаў. Падзеі разьвіваюцца страшэнна скора і чакаць ня можна ані хвілі.

# Ліквідацыя Грамады і Н. П. Х.

## Грамада і Н.П.Х. абвешчаны партыямі нелегальнымі. Належаньне да гэтых партыяў будзе перасьледавацца са усей суровасьцю закону.

Па арыштаваньні ў студню б. г. грамадаўскіх паслоў наступіла і аканчальная ліквідацыя Грамады і Н. П. Х. Урад рашыўся на гэткі крок толькі ў апошні час, калі арганізацыя Грамады, напалоханая арыштамі, зьмяніла тактыку і распачала тайную канспірацыйную работу.

З распараджэньня Міністэрства Унутраных Справаў на дзень 21 сакавіка вызнанана аканчальную ліквідацыю як Грамады, так і Незалежнай Партыі Хлопскай.

### Адозва Віленскага Ваяводы.

Віленскі Ваявода выдаў да насяленьня спэцыяльную адозву, у якой між іншым гаворыцца: Матарыялы, якія папалі ў рукі ўлады сцьвердзілі, што Грамада і Н.П.Х. амаль ад самага пачатку свайго арганізаваньня былі пад уплывамі чужых чыннікаў і пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пашыраючы сярод насяленьня комуністычную агітацыю і падбураючы да рэвалюцыйнай работы скіраванай проці палітычнага ладу Польскае Дзяржавы.

Дзейнасьць гэтых яўных партый, прыкрываючых сапраўды комуністычную рэвалюцыйную акцыю і карыстаючыхся для зьвербаваньня сабе маласьвядомых элемэнтаў рознымі дэмагагічнымі лёзунгамі, уводзіла сьвядома і праграмова да грамадзянства раскладовыя элемэнты, стараючыся падарваць правапарадак і выступаючы такім чынам проці публічнага спакою і бясьпекі.

Дзеля гэтага п. Міністар Унутраных Справаў ня могучы цярпець гэтых небясьпечных і варожых Ураду партый абвесьціў Грамаду і Незалежную Партыю Хлопскую арганізацыямі забароненымі—нелегальнымі.

Перасьцерагаю, што адгэтуль кожны хто ня гледзячы на гэтую перасьцярогу будзе далей належаць да Грамады, або Незалежнай Партыі Хлопскай, або прымаць нейкі ўдзел у дзейнасьці гэтых партый, як адгэтуль забароненых, будзе пацягнуты да карна-судовае адказнасьці з усёй суровасьцю права.

### Ліквідацыя у Вільні.

У памешканьнях сэкрэтарыятаў Грамады і Н.П.Х. у Вільні былі зроблены рэвізіі, прычым часьць папераў і актаў забрана. Самыя памешканьні апячатаваны.

### Ліквідацыя на мяйсцох

У паветах Дзісьненскім, Пастаўскім, Маладэчанскім, Вялейскім і Сьвянцянскім апечатаваны павятовыя сэкрэтарыяты Грамады. Канфіскаваны печаткі і штэмплі арганізацыі.

У павеце Віленска-Троцкім гурткоў Грамады ня было. Тут працавала НПХ. Па ўсім сэкрэтарыятам зроблены вобыскі.

### Канец Беларускага каапэратыўнага Банку.

Зьліквідаваны Беларускі Каапэратыўны Банк з аддзеламі ў Пінску і Глыбокім. Вызначана спэцыяльная ліквідацыйная камісія, са скарбовым камісарам на чале, якая і правядзе ліквідацыю актываў і пасываў Банку. Падгатаваўчая да ліквідацыі праца вялася ўжо даўно. Улада правяла рэгістрацыю сябраў Банку і выясьніла вышыню ўкладаў і іх паходжаньне.

## Зьмена выбарнага закону.

Канстытуцыйная камісія Сойму працуе над зьменай „ардынацыі выборчай".

З газэт



Асьцярожна паны, Стронскі, Вітос і Гломбінскі з перароблкай „ардынацыі выборчай" — мае яна ў сабе войстры выбуховы матар'ял.

„Robotnik".

## Упадак Шанхаю.

21 сакавіка кантонскае войска ўступіла да прадмесьцяў Шанхаю. Жалезная дарога аказалася ў іх руках і такім чынам была перарвана камунікацыя з Нанкінам.

Адначасна з уваходам кантонцаў забаставала шмат работнікаў. Але ўсё-ж забастоўка не пашырылася на ўсіх работнікаў.

Ужо на другі дзень распачаліся грабежствы і забойствы.

На тэрыторыях чужаземных канцэсіяў пакуль што спакойна.

Некалькі сот кантонскіх жаўнераў прабавала ўварвацца на аглійскую канцэсію, але яны былі зараз-жа разаружаны і выгнаны

Падчас гэтага шмат з нападаючых згінула, бо англійцы ўжылі кулямёты.

Аканчальна Шанхай яшчэ не апанаваны кантонцамі, але гэтага трэба чакаць кожны дзень.

## У С. С. Р. Р.

### Чэрэпавецкія хуліганы.

„Красная газэта" падае: Чэрэпавецкая губэрнія даўно ўжо славілася сваімі хуліганамі. „Чэсьць" цэлай губэрніі падтрымалі нядаўна тры найгоршыя хуліганы: Волкаў, Шалурын і Вінаградаў. Сярод белага дня яны ўламаліся ў в. Сабалёва да хаты селянкі В., выламалі дзьверы, выбілі шыбы і вывярнулі ганак. Гаспадыне ўдалося ўцячы, і ўсю сваю злосьць хуліганы выліліі на яе 15-ці гадовай дачцэ: пабілі яе, па чарзе гвалцілі, мучылі. На шум і гвалт сабраўся натоўп сялян, на якому хуліганы пачалі страляць. З вялікім трудом удалося іх арыштаваць, пры чым пры перастрэлцы Волкаў быў забіты. Іншых судзіў у Чэрэпавецы губэрнскі суд Аднаго хулігана расстрэлялі, а другому далі 5 гадоў турмы.

### Расфарміраваны батальён за адмову страляць у рабочых.

Па распараджэньню Варашылава батальён Н-скага пяхотнага палка, які стаяў на ахране прадпрыемстваў Кузбаса, як разлажыўшыйся—расфарміраваны. 85 чырвонаармейцаў адпраўлена ў штрафныя часьці, а рэшта ў распараджэньне вайсковага каманданьня Узбекстанской рэспублікі для папаўненьня карацельных атрадаў, дзействуючых проці басмачоў.

Расфарміраваньне атраду зьяўляецца рэзультатам адмовы чырвонаармейцаў разагнаць натоўп шахцёр ў 2 лютага, зьявіўшыхся да ўпраўленьня Кузбаса з трэбаваньнем—зьвярнуць раней запрацаваныя і ня выплачаныя грошы. Між іншым пры перагаворах шахцёраў з адміністрацыяй быў пабіты паўнамоцнік прафэсыянальных саюзаў комуніст Назарэнка

### Роспуск партыйнай арганізацыі.

Па пастанове цэнтральнай кантрольнай камісіі распушчана ўся арганізацыя комуністычнай партыі ў Саратаве. Сярод комуністаў выкрыты вялікія надужыцьці, падлогі, растраты і іншыя ўгалоўныя праступленьні.

## Да апошняй сэсіі Лігі Народаў.



Міністры заграцічных справаў: Брыян (францускі), Штрэзэман (нямецкі), Залескі (польскі), Ішы (японскі), Шалойя (італьянскі) і Чэмбэрлен (англійскі).

# ЗНАЧЭНЬНЕ САМАЎРАДАЎ.

Даўно ўсім ведама, што палітычная сіла кожнай дзяржавы цалком залежыць ад гаспадарчага дабрабыту яе насяленьня, ад ладу і вышыні яе эканамічнага разьвіцьця. Тут унутры, у гаспадарчай сіле ляжаць трывалыя крыніцы запраўднай незалежнасьці дзяржаўнай палітыкі і ваеннай адпорнасьці дзяржавы і яе аўтарытэту і ўплываў на міжнародным полі. Але ўсё гэта неяк дрэнна разумелася ў Польшчы. Дагэтуль польскія палітыкі думалі і рабілі зусім наадварот: на унутраны лад, на гаспадарчы дабрабыт краю амаль зусім не зварачвалі ўвагі, а шукалі апоры або ў мілітарнай сіле арміі, або па замежамі краю ў міжнародных трактатах, у дыплёматычных штуках аб рожных „гарантыях" Лігі Нацыяў і вялікіх дзяржаваў паасобна, якія як цяпер добра ўсім ведама з гісторыі нашай сучаснасьці, ніколі нікаму нічога не загварантуюць, калі няма ўласнай запраўднай сілы, ладу, крэпасьці і трываласьці ў гаспадарчым арганізме дзяржавы. І вось гэтую старую ісьціну Польшча, толькі пасьля 8 гадоў уселякіх дорага каштуючых ей спробаў пачала здаецца, разумець. Новы ўрад паставіў гаспадарчую кансалідацыю краю, падняцьця дабрабыту яго насяленьне, пляновую эканамічную палітыку дзяржавы як фундамэнт сваей працы. Адзін па адным міністры ўраду Маршалка Пілсудксага заявілі ў сваіх дэклярацыях аб важнасьці і значэньні для Польшчы як заграніцай, так і ўнутры краю падняцьця яе гаспадарчай моцы. І вось неспаўна год як распачаў гаспадарчую пляновую працу ў гэтым напрамку ўрад, а рэзультаты яе ўжо гэтак ясна і выразна азначыліся ўва ўсіх галінах жыцьця, што гэтаму ня могуць запярэчыць нават найвялікшыя праціўнікі ўраду. Толькі гэтай працай у першы раз у Польшчы асягнуты зраўнаважаны бюджэт, падстава самастойнай дзяржаўнай палітыкі. Бязумоўна якраз гэтая праца, стварыўшы апору ўнутры краю, дала ў сваіх выніках Польскай Дзяржаве яшчэ нябывалыя ўплывы, нябывалую актыўнасьць і на грунце міжнароднай палітыкі. А трэба сказаць, што гэта-ж толькі яшчэ пачатак. Праца над гаспадарчай кансалідацыяй краю павінна ісьці ўсё далей ды шырэй.

Прайшлі ўжо тыя часы, калі дзяржаўная ды грамадзкая гаспадарка вяліся ў крах чыноўнікамі. Бюрократыя аджыла свой век і не ўваскрэсьне больш ніколі. Сяньня дамінуе прынцып: што ўсё што робіцца для народу павінна рабіцца праз гэты ж народ арганізаванымі яго сіламі. Гэты прынцып сучаснае дэмакратыі ажыўляецца ў галіне адміністрацыйна-гаспадарчай працы ў так званым мясцовым самаўрадзе.

Мясцовыя самаўрады маюць перад усім гэтае вялікае значэньне гаспадарча-арганізуючае, як найлепшы спосаб пляновага і паступовага будаваньня гаспадарчага дабрабыту краю і культурнага разьвіцьця насяленьня ўсімі жывымі сіламі самага насяленьня. Гэткім чынам самаўрады зьяўляюцца найлепшай практычна-трудавою школай для шырокай грамадзкай працы, якая ўзгадоўвае запраўды здольныя сілы для яшчэ больш шырокай гаспадарчай працы ў дзяржаўным маштабе. Прайшоўшы гэтую практычна творчую грамадзкую школу людзі з мейсцаў трапляючы праз выбары ў парлямэнт ці да цэнтральных дзяржаўных установаў маюць адну характэрную рысу, маючую вялікае значэньне, рысу, якой якраз не хапае розным нашым скорасьпелым палітыкам, якія сядзяць у Соймах і Сэнатах па „выбару" розных палітычных партыйных камітэтаў, альбо проста ўплывовых адзінак. Гэтая рыса ёсьць *грамадзкая адказнасьць*.

Адказнасьць гэта ёсьць перад усім — *веда* практычная, выпрабаваная на ўласным досьледзе; кожнаму ясна, што калі заканадаўцы ці прадстаўнікі загадуючай улады не маюць гэтай веды—адказнасьці, дык іх улада можа быць шкоднай на кожным кроку.

А колькі гэткай шкоды толькі пасьля 8 гадоў прызнанай бязспрэчнай нарабілі ў Польшчы рожныя палітыкі ды палітыканы. Ці ж не ў выніку поўнай кампрамітацыі дый банкроцтва гэткіх безадказных, а часта проста безграматных палітыкаў узяў у свае магутныя рукі ўладу ў Польшчы маршалак Пілсудскі. Дык вось, праца ў самаўрадах зьяўляецца школай, дзе людзі робяць спробы, вучацца, скуль пасьля запраўдныя грамадзкія дзеячы выходзяць на шырэйшае поле дзяржаўна-гаспадарчай працы, маючы ўжо практычны досьлед і веду.

Але апрача веды — адказнасьці мясцовая грамадзка-гаспадарчая школа дае дзеячам і іншага роду адказнасьць — маральна грамадзкую.

Пачуцьцё гэтай маральнай адказнасьці, якой часта густа гэтак мала засталося ў паваенным грамадзяніне, выробляецца шляхам *выбарнасьці* самаўрадовых уладаў, гэтая выбарнасьць ёсьць падставай крэпасьці самаўраду, яго юрыдычна-прававою формаю. Ці-ж не ясна, што таго, хто на адказным мейсцы будзе дрэнна весьці грамадзкую гаспадарку, выбаршчыкі ў другі раз ужо безумоўна ня выбяруць, а то яшчэ наложуць кантроль і рэвізыю на дзейнасьць і могуць пацягнуць да адказнасьці. Гэткім шляхам ідзе вольная і самастойная творчая праца ў самаўрадах над будаваньнем агульнага дабрабыту краю, усебакова узгадоўваючы грамадзянства наагул і паасобныя найбольш выдатныя адзінкі дзеля больш шырокай працы.

З дзьвюх гэтых адказнасьцяў – практычна рэчавай і маральна-юрыдычнай выпрацоўваецца ў самаўрадовых дзеячох на мейсцох *адказнасьць палітычная*. Палітычная адказнасьць за ўсё дзяржаўнае жыцьцё. Гэтай палітычнай адказнасьці ў Польшчы на жаль як раз мала. Нават найвыдатнейшыя „палітыкі" часта кіруюцца альбо сваімі асабістымі інтарэсамі, альбо інтарэсамі *сваей* партыі, *сваей* групы, сваёй клясы, што часта пярэчыць *агульным* інтарэсам дзяржавы. Гэтая клясавая, ці партыйная аднабокасьць і сьлепата, якія не дбаюць аб агульным інтарэсе дзяржавы— ёсьць няшчасьце сучаснай Польшчы, дый гэта ўсё—ня дзіва: Польшча—новая дзяржава, у якой амаль ня ўсё прыйшлося рабіць ад пачатку, нанова. Але—тым больш патрэбна для яе добрая „пачатковая школа", грамадзка-дзяржаўнай працы, якой, як сказана, зьяўляюцца-самаўрады.

Трэба яшчэ адзначыць зусім асабліва значэньне „крэсавых" самаўрадаў у Польшчы—у нашым краі, з мяшаным насяленьнем, польскі элемэнт мае вялізную перавагу, як прадстаўнік, так званай „дзяржаўнай нацыянальнасьці", палітычнай улады, вышэйшай культуры, але беларускае насяленьне мае ня менш вялікую ды ўсё узрастаючую – ў дэмакратычнай рэспубліканскай дзяржаве — сілу і вагу: вялізную большасьць!

Што значыць гэткае аднашэньне ды разьдзяленьне сілаў і вартасьцяў у насяленьні нашага краю? Перад усім гэткі стан рэчаў у Краі накладае на польскі элемэнт асаблівую адказнасьць, як на кіраўнікоў і вучыцялёў адміністрацыйна-гаспадарчай працы самаўрадаў. Але беларуская большасьць насяленьня мае няменш бязспрэчныя правы вымагаць, каб гэтая праца скіроўвалася яўна і сумленна перад усім — на абслугоўваньне патрэбаў і інтарэсаў гэтай вялізарнай большасьці, дый мае безумоўнае права сачыць, каб гэтая адказнасьць выбарных уладаў была ня фікцыйнай (фальшывай), але рэальнай і запраўднай.

Адзін шлях да гэтага, гэта шлях шчырай і сумленнай супольнай працы — на роўных правах — над будаваньнем супольнага дабрабыту краю.

Дык, калі цэнтральныя ўлады Польскай Рэспублікі апрацуюць добры закон аб самаўрадах, які б, з аднаго боку даў магчымасьць папасьці ў органы мясцовых самаўрадаў якраз найбольш цэнным і адказным працаўніком з мясцовага насяленьня, а з другога боку здалеў бы гэтыя органы самаўраду зрабіць ня толькі блізкімі, але папросту *сваімі* для насяленьня, тагды ў гэтай новай школе— практычнай, рэчовай, карыснай для ўсяго насяленьня краю працы якраз і пачне адбудоўвацца тое, чаго не хапае цяпер у нашым краі (што – трэба прызнацца—страчана ў нас з віны польскай улады)—пачне адбудоўвацца ізноў — *паразуменьне і зьбліжэньне беларускага народу з польскім*.

Бо-ж няма лепшай школы, лепшага грунту для гэткага зьбліжэньня, як супольная, шчырая, рэчовая, гаспадарча-творчая, грамадзкая праца—над падняцьцем дабрабыту і культуры краю, праца, яўныя карысьці якой для ўсяго насяленьня будуць сьцьвярджацца на кожным кроку.

Гэткая праца ў самаўрадах — ня толькі падстава дзяржаўнага быту і дабрабыту Польшчы, але папросту — *зарукак яе трывалага існаваньня!*

Калі Польшча добра разьвяжа заданьне самаўрадаў у нашым краі, калі праца ў іх запраўды пойдзе ў тым напрамку, аб якім мы казалі, з усімі яго нацыянальна-палітычнымі скуткамі, тагды толькі Польшча можа быць пэўнай, што яе „ўсходнія крэсы" з часам стануць арганічнай часткай дзяржавы. Бо ж толькі добра ўзгадаваны ў гэтай добрай школе беларускі народ, дэмакратычны гаспадар свайго краю, якому эканамічны дабрабыт і культура з часам дасьць поўную рэальную ўладу ў краі, зробіцца шчырым прыяцелем Польшчы—ацаніўшы ўсе бязспрэчныя карысьці — дзяржаўнага сужыцьця ды супрацоўніцтва з польскім народам.

Усё гэта, здаецца, пачалі ўжо ясна разумець у Польшчы. Сучасная польская ўлада, як ясна з ведамай прамовы віцэ-прэм'ера Бартля, рубам паставіла справу ўвядзеньня самаўрадаў у жыцьцё ў найхутчэйшым часе. Паралельна з гэтым ідзе ў соймавай камісіі гарачая праца па апрацаваньню адпаведнага закону, выдаць які шляхам дэкрэту урад ня мае паўнамоцтваў. З гэтага відаць, што справа пастаўлена на чаргу дня, і з яе зьнята быць ня можа — без яўнай вялікай шкоды для мясцовага насяленьня і для польскай дзяржавы.

Агляд гісторыі гэтай працы ўраду і камісіі, а так сама сучасны яе стан — дамо далей.

## Перасьледаваньне царквы у С. С. Р. Р.



Першая фатаграфія прадстаўляе мітрапаліта Кірыла арыштаванага ў Маскве і высланага да Пермі.

На фатаграфіі другой бачым архіепіскапа Іларёна, які знаходзіцца ў Салавецкім концэнтрацыйным лагэры.

# Палітычны агляд.

Уся Ўсходняя Эўропа знаходзіцца яшчэ пад моцным уражаньнем рыскага гарантыйнага дагавору, заключанага між Радавай Расеяй і Латвіяй. Уся амаль бяз выняку польская прэса бачыць у гэтым паражку польскай дыплёматыі ў Прыбалтыцы і аднаўленьне Радавай Расеяй традыцыйнай палітыкі царскай Расеі, якая бязупынна імкнулася к апанаваньню Чарнаморскага і Прыбалтыцкага пабярэжжаў. Дзеля гэтага зусім аднабокім зьяўляецца погляд тых, хто зьвязвае апошнія крокі радавай дыплёматыі ў Прыбалтыцы з падзеямі ў Кітае і англійска-бальшавіцкай барацьбой. Гэтыя абставіны можа быць толькі прымусілі маскоўскі Ўрад к хутчэйшаму спаўненьню накрэсьлянага пляну, пакуль Англія не апанавала палітычна ці эканамічна Прыбалтыцкімі Рэспублікамі.

Хто ўважна сачыў за радавай палітыкай апошніх гадоў, той ня мог не заўважыць сталага і ўпорчывага імкненьня Масквы к разьбіцьцю заходняга антыбальшавіцкага фронта шляхам вынятка Прыбалтыцкіх рэспублік з пад уплываў Польшчы ці Англіі. Польшча, як ведама, даўно прыхільнай была заключыць агульны гарантыйны дагавор з Радавай Расеяй, які абымаў бы і Прыбалтыцкія рэспублікі. Але Масква ад пачатку стаяла на грунце паасобных ці рэжыёнальных дагавораў з кожнай дзяржавай і гэтай мэты яна дасягнула. Цяпер яна мае гэткі дагавор з Літвою і Латвіяй, і яшчэ ня скончыліся перагаворы з Эстоніяй, якая ў канцы—канцоў прымушана будзе пайсьці на ўступкі бальшавікам, ня гледзячы на тое, што моцна залежыць ад Лігі Народаў, ад якой нядаўна атрымала грашовую пазыку. У гэтым выражаецца трагэдыя малых новастворaных у выніку сусьветнай вайны дзяржаваў, лёс якіх залежыць ад мацнейшых суседніх вялікіх дзяржаваў. Літва, Латвія і Эстонія зусім добра прадстаўляюць сабе, што ні ўласнаю сілаю аружжа, ні саюзамі з Польшчай ці Англіяй не абароняць сваей незалежнасьці, ў выпадку аружнай спатычкі са сваім усходнім суседам. Вось дзеля чаго Коўна, Рыга

# Маленькі фэльетон.

### Хто я такі ёсьць.

(*Ўспаміны з памятнай кніжкі старога Беларуса*)

(Глядзі „Бел. Слова" № 5, 7).

(ПРАЦЯГ).

На „пэйсахоўку" да Янкеля сабралася— уф!—уся нашая меншасьць... Было ня шмат, але і не мала..

Хітры Янкель гэтак скамбінаваў, што лік прысутных асобаў выносіў, як раз, лічбу нумара нашага сьпіска меншасьці — дванаццаць жыдкоў, тры беларусы і адзін маскаль— разам шаснаццаць...

Як асоба даверра жыдоўскае меншасьці Янкель стараўся і прыкладаў ўсе высілкі, каб ягоная... „пэйсахоўка" выглядала-б, як банкет, ці як нейкая перадвыбарная канфэрэнцыя... І быў ўважны, гасьцінны, але і паважны..

— Ну, паночкі, пане Міхась, пане Язэп і вы пане Мацей і вы Александр Іванавіч — быццам мітусіўся ён — калі ласка, будзьце як у сябе ў хаце... Мы-ж ужо сабе хаўрусьнікі.. Што вы, што мы — гэта ўжо ўсё роўна... Адзін за ўсіх, усе за аднаго...

— І вам будзе добра і нам—дадаў стары Моўша — і калі пасьля прыедзе наш пасол і спытаецца, што табе Моўша цяпер'ка трэба?! Ну?! Ну дык я яму скажу: пане пасол, мне трэба, каб вы сабе сядзелі ў Сойме і атрымлівалі добрыя „дыеты"... А Мойшэле?! Што Мойшале?! ён сабе скромны чалавек — маленькую толькі канцэсію на сьпірт, ці гуртоўню табачную, і ўсё... А вос—скажу— пане пасол, у мяне ёсьць стары сусед Язэп— уй пане пасол — вось яму, калі ласка, дайце кавалак зямлі з лесам і грошаў на адбудову..

— Ото зэ!.. ото!.. Загэргаталі іншыя жыды...

— Бо калі стары Мойшале будзе мець канцэсію на гарэлку ці табачную гуртоўню— цягнуў далей Моўша—а Міхась, альбо Язэп, ці хтось іншы ня будуць мець добрае гаспадаркі, дык усё будуць браць у мяне на павер... Ну?! І якая будзе ад гэтага карысьць мне, ці ім?!

— Правідлова!.. Правідлова Моўша кажа — згаджаюцца нашыя...

— Табе бы Мойша быць пасломм, а не каму іншаму...

— Ну, а чаму і не?!.

— Чым ён гарэй ад доктара Выгодскага, ці доктара Шабата?!.

— Ша, ша!..—умяшаўся Янкель — які Мойша пасол?! Тыя дактары будуць лячыць усе нашыя нацыянальныя хваробы, а Мойша што!? Толькі і ведае, што сваю крамку...

І гэтак гутарачы асушалі мы пэйсахоўку бутэльку за бутэлькай і была бы поўная згода і ўсё бы скончылася ў парадку, каб не ўмяшалася тутака пытаньне чыста нацыянальнае. Калі языкі ўжо добра разьвязаліся, а ногі самы сабой быццам захадзілі —зацягнулі жыды, як на грэх „маёхэс".. Паўск півалі са стала і пачалі скакаць.. Ня вытрымалі тутака нашыя...

— Як гэта?! — крычаць — каб на нашай зямельцы, на беларускай, дый распачынаць скокі „маёхасам", не! Не надаецца! . Далоў...

— Валяй, браткі, „лявоніху", ці „юрку" — і поўлазалі нашыя ў іхняе кола і давай расьпіхваць жыдоў... Старому Мойшэ амаль што не абарвалі лапсардак..

— Ша, ша!. Ну пане Язэп, ну пане Міхась — умяшаўся ізноў Янкель і пачаў ўсіх супакойваць. — Мы-ж хаўрус!.. Мы-ж меншасьць, і ўсе аднальковыя..

— Як аднальковыя?!. – Крычэлі нашыя— мы беларусы — народ хрышчоны, а вы..

І тутака яшчэ большая распачалася бы спрэчка аб веры і давяла бы можа зусім да распаду нашае меншасьці, каб не маўчаўшы да гэтага часу наш адзіны прадстаўнік маскалёў не парашыў, што і яму ўжо пара ўмяшацца..

— Ша кіндэр!—Закрычэў — губэрнатар, фур!.. Ня трэба нам ні маёхаса жыдоўскага, ні лявоніхі беларускай! . Давай, рабята, „казака", ці „барыню" нашую плясавую!..

Ну ўжо і мы і жыды запратэставалі..

І ён, як той казаў — аб чым цьвярозы маўчыць, аб тым п'яны крычыць — пачаў ўжо па іншаму...

— Баларусы — кажа — нейкія знайшліся тутака!.. Я вас—так вас, раз так — пачаў лаяцца—усіх павыганяю!.. Дачакаецеся!.. Меншасьці нейкія павыдумлівалі... правоў трэба?! Вось прыдуць нашыя! Мы вас—так вас разтак —пакажэм... І вам пагрому захацелася — накінуўся ён і на жыдоў і палез па пэйсы Янкеля...

— А бальшэвікес!.. Большэвікес—ізноў загэркалі жыды ..

І толькі калі Сора прынясла новую порцыю пэйсахоўкі і ён і ўсе пасупакоіліся..

Разыйшліся ўсе пагадзіўшыся...

Нядзеля: з самае раніцы, як толькі паказаўся сьвет, выехалі нашыя ў мястэчка на выбары... Усе былі нейкія задумчывыя і паважныя... А ў кожнага ў кішані сьпісак № 16...

# ФІНАНСЫ І ГАСПАДАРКА.

## Земляробскі крэдыт.

Экспэртная земляробская камісія зьвярнулася да Ураду з мэмарыялам па пытаньню аб барацьбе з грашовай ліхвай на вёсцы і стварэньні абаротнага фонду земляробскага крэдыту. На гэты мэмарыял міністар земляробства адказаў пісьмом, у якім згаджаецца з слушнымі пастулятамі камісіі экспэртаў і дакляруе, што зьвернецца да Польскага Банку з прапазыцыяй, каб пашырыў крэдыты для земляробства пры ўчоце (дысконце) 6-ці месячных земляробскіх вэксаляў. Цяпер выдаюць крэдыты для дробнага земляробства: Państwowy Bank Rolny, Unja Związków Spółdzielczych i Centralna Kasa Spółek Rolniczych. Уклады ў Państwowym Banku Rolnym апрацэнтаваны ад 1 прац. да 3 прац. за год. Ен праводзіць акцыі крэдытаваньня штучнага ўдабрэньня, закупкі земляробскіх прыладаў і пашырыў крэдыты для крэдытных каапэратываў. Для закупкі насеньня з пачаткам гэтага года вызначана сума ў 8,5 міл. зл. Ад кастрычніка мінуўшага года Państw. Bank Rolny атрымаў на крэдытаваньне земляробскіх каапэратываў 10,800,000 зл. На крэдыт для Centralnej Kasy Spółek Rolniczych вызначана 6,500,000 зл. на 5 г. Капітал Państw. Banku Rolnego павялічаны на 13 міл. зл. і крэдыт Centr. Kasy Sp. Roln. у Banku Polsk. павышаны на 1 мільён, нарэшце Państw. Bank Rolny атрымае 11 мільёнаў зл. на выкуп маёмасьці, падлежачай ліквідацыі.

* * *

Міністар Скарбу выдаў Дзяржаўнаму Земляробскаму Банку 2 міл. зл. на пасеўныя крэдыты для дробнага земляробства. Да гэтай пары на гэтую мэту выдана 8,5 міл. зл., якія міністар земляробства падзяліць між ваяводзтвамі, ваяводзкія камісіі паміж паветамі, а апошнія паміж гмінамі. Адначасна міністар скарбу распарадзіўся выдаць 2 міл. зл. Дзярж. Земляробскаму Банку на крэдыты для дробнага земляробства, які будзе выдавацца пры пасрэдстве гмінных касаў.

## Скасаваньне пошліны за перавозку картоплі.

У „Dzienniku Ustaw" зьмешчана распараджэньне, на моцы якога картопля для насеньня можа прывазіцца ў часе ад 15 сакавіка да 1 чэрвеня без аплаты пошліны, толькі для гэтага трэба атрымаць дазвол.

## Прадукцыя сьпірту ў Польшчы.

Дзеля таго, што ў некаторых газэтах былі зьмешчаны фальшывыя весткі аб прадукцыі сьпірту ў часе 1925—26 г., афіцыяльна паведамляецца што ў гэты пэрыяд было чынных 1,347 бравараў, якія выгналі 625,995 гэкталітраў 100 градуснага сьпірту. У 1924—25 г. было 1,283 бравараў, якія выгналі 720,662 гэкталітраў 100 град. сьпірту.

## Біржа.

| | |
|---|---|
| Даляры | 8, 94 - 8, 90 зл. |
| Залаты рубель | 4, 73—4, 74 зл. |
| Сярэбраны рубель | 2, 75 зл. |
| Чырвонец | 33, 75 зл. |

### Збожжа

*(Варшава)*

| | |
|---|---|
| Жыта (100 кілагр) | 42, — 42, 50 зл. |
| Пшаніца „ „ | 57 зл. |
| Ячмень брав. | 35 — 39 зл. |
| Авёс „ „ | 37, — — зл. |

*(Віленшчына)*

| | |
|---|---|
| Жыта (100 кілагр.) | 42 — 44 зл. |
| Авёс „ „ | 39 — 41 зл. |
| Пшаніца „ „ | 50 — 51 зл. |
| Ячмень браваровы | 39 — 42 зл. |

Рэваль і Фінляндыя катэгарычна адмовілі Польшчы ў прапанаваным палітычным збліжэньні і пайшлі на згоду з Масквою, у руках якой знаходзіцца лёс іх. Гэта ўсё прызнаюць у Коўне, Рызе і Рэвалі, але іншага выхаду німа, як не было іншага выхаду для Нямеччыны і яе хаўрусьнікаў пасьля паражэньня ў 1918 г., як толькі падпісаць Вэрсальскі, С.-Жэрмэнскі, Трыянонскі і інш. трактаты. Адзіным адказам на гэта былі рэвалюцыйныя пераварoты і тэрарыстычныя акты проці тых асобаў, якія мусілі падпісаць гэтыя трактаты (забойства Эрцбэргэра, падпісаўшага Вэрсалькі трактат). Гэта самае мы бачым цяпер і ў Прыбалтыцы. Адказам на заключэньне літоўска-радавага гарантыйнага дагавору быў палітычны пераварот на Літве. Але новы літоўскі ўрад не адважыўся ануліраваць гэтага дагавору. Гэтакае-ж самае незадаваленьне заключаным пактам заметна і ў Латвіі, дзе можна кожную хвілю чакаць унутранага дзяржаўнага пераварота, які можа на некалькі дзён спазьніўся з поваду сьмерці прэзыдэнта Чакстэ, саўпаўшай як раз з падпісаньнем дагавору. Але і тут, як на Літве, ня прыходзіцца спадзявацца на перамену пазыцыі ў адносінах да Масквы. Юрыдычная і маральная адказнасьць за трагізм новастворaных дзяржаваў падае на тварцоў Вэрсальскага трактату і Лігу Народаў, якія паклікалі да палітычнага жыцьця гэтыя дзяржавы, прызнаюць на паперы іх незалежнасьць, але ня могуць гарантаваць яе фактычна.

Латвійска-радавы дагавор зьяўляецца маральным ударам ня толькі для Англіі, але гэтак сама і для Лігі Народаў. Адзін з артыкулаў яе гаворыць: „на выпадак аружнага нападу з боку трэцяй дзяржавы на адну з дагаварыўшыхся старон, другая старана ня мае права прыступаць да коаліцыі, скіраванай проці гэтай стараны і прыймаць удзел у якіх небудзь гаспадарчых ці фінансавых байкотах, скірав ных проці аднэй з старон". Гэта як раз пярэчыць 16 артыкулу статуту Лігі Народаў, які прадбачыць фінансавы і гаспадарчы байкот проці дзяржавы, напаўшай на сябра Лігі Народаў і ўсе сябры Лігі Народаў мусяць падпарадкавацца гэтаму вымаганьню. Латвія, як ведама зьяўляецца сябрам Лігі Народаў. Як яна выйдзе з гэтага палажэньня і як сама Ліга разгрызе гэты гарэх, невядома. Гэты факт яшчэ раз сьведчыць, як нізка стаіць аўтарытэт Лігі Народаў, сябры якой дзеля ратаваньня сваей незалежнасьці прымушаны ламаць яе пастановы. Першы вылам у статуце Лігі зрабіла Нямеччына, якая выгаварыла для сябе ў Локарно права невыпаўненьня 16 параграфу. Сьледам за ёй пайшла Літва і Латвія. Далей трэба чакаць гэтакага-ж кроку з боку Эстоніі. Сябра Лігі — Італія, дык тая зусім не знаходзіць патрэбным лічыцца з статутам Лігі. У часе канфлікта з Грэцыяй два гады таму назад яе насільна ўстрымалі ад аружнай расправы з слабейшым сябрам Лігі. А цяпер адкрыта пасягае на незалежнасьць Албаніі, пагражае тэрытoрыяльнай нетыкальнасьці Юга-Славіі, творачы палітычную атмосфэру на Балканах зусім падобна таму, як рабіла Аустра-Вэнгрыя ў 1914 г. і Ліга Народаў маўчыць, як набраўшы вады ў рот. Калі ня можа нічога зрабіць з Радавай Расеяй, якая зьяўляецца выразным ворагам яе і стараецца шкодзіць ей на кожным кроку, дык хоць бы падтрымала свой аўтарытэт у адносінах сваіх сябраў, пачынаючы з Італіі, якая чуе сябе менш зьвязанай на Балканах, чым Радавая Расея ў Прыбалтыцы.

Гэтая агрэсыўнасьць Італіі на Балканах дае бальшавікам повад да новай дыплёматычнай акцыі на міжнародным грунце. Італія атрымала свабоду дзейства на Балканах і Блізкім Усходзе ад Англіі за тое, што далучылася да антыбальшавіцкага блёку і памагае ёй у Шанхае. Але гэта „гаспадараваньне" Італіі на Балканах і Бл. Усходзе ня можа падабацца Францыі, цесна зьвязанай палітычна і эканамічна з гэтымі краямі. Нагул француска-італьянскія адносіны ў другой палавіне прошлага і пачатку гэтага году вельмі папсаваліся. Некалькі разоў даходзіла нават да ваенных узброеных дэманстрацыяў на француска-італьянскай граніцы. І калі толькі бальшавікі не скарысталі да гэтай пары гэтага факту, дык гэта тлумачыцца тым, што яны ў апошні час былі вельмі заняты ў Кітае і не хацелі псуць адносінаў з Італіяй. Але калі Італія выразна выступіла проці іх, прызнаўшы бэсарабскую граніцу і перайшоўшы на бок Англіі, дык гэта развязвае рукі бальшавікам, якія адразу пачалі антыітальянскую акцыю. Чычэрын, „лячыўшыся" ад нявядомых хваробаў у Вісбадэне, раптам абарваў свой адпачынак і выехаў цераз Бэрлін да Парыжа. Гэты маршрут лепш усяго п казвае кірунак радавай палітыка. Ен мусіць паразумецца з Штрэзэманам, які, здаецца, падгатовываў грунт для француска-радавае згоды калі быў у Жэнэве. А затым Чычэрын мае замер скарыстаць для сваіх новых мэтаў гандлёвыя перагаворы, якія вёў Ракоўскі ў прошлым годзе і якія не маглі рушыцца з мёртвага пункту з-за ўпорства бальшавікоў у пытаньні аб царскіх даўгах Францыі. Калі-б толькі бальшавікі прызналі царскія даўгі, дык нічога не стаяла бы на шляху да француска-радавага зблізэньня. Дзеля гэтага Чычэрын і рашыў асабіста адведаць Парыж, каб падгатаваць грунт для будучых перагавораў і між іншым, што здаецца, ў плянах Чычэрына займае першае мейсца, спрабаваць пасеяць нязгоду між Францыяй з аднаго боку і Італіяй з Англіяй з другога, указаўшы на небясьпеку з боку Італіі на Балканах і Бл. Усходзе. Зусім магчыма, што Чычэрыну пашанцуе схіліць Францыю на свой бок, прыняўшы пад увагу агульнае незадаваленьне ў Францыі агрэсыўнай палітыкай Італіі. У кожным разе Францыя можа скарыстаць гэтыя перагаворы з Чэчэрыным, як тактычны прыём для аказаньня адпаведнага ўражаньня ў Рыме і Лёндане. Зусім магчыма, што і Бэрлін прыложыць да гэтай акцыі сваю руку, каб крыху аслабіць англійскі ўплыў на на Заходня-эўрапэйскую палітыку.

І ў той час, як навокала Польшчы насьпяваюць новыя палітычныя падзеі, творацца палітычныя блёкі і камбінацыі, унутры яе ўспыхнула агульная забастоўка работнікаў валакністай прамысловасьці, якая можа мець вельмі паважныя вынікі для агульна-дзяржаўнага эканамічнага жыцьця. Бастуе каля 150,000 работнікаў лодзінскага і іншых цэнтраў валакністай прамысловасьці. Штодзенныя страты дасягаюць мільёна зл. Работнікі жадаюць 25% прыбаўкі да заработнай платы ў той час, як прамыслоўцы скардзяцца на тое, што ня могуць вытрымаць нават старых ставак. У Горнай Дамброве гутнікі адмовіліся з 1 красавіка ад старых умоваў дзеля таго, што з поваду крызісу ў вугальнай прамысловасьці ня могуць выплачаваць старых ставак і хочуць панізіць плату. Адсюль гэткія запярэчаньні: работнікі трэбуюць прыбаўкі, прамыслоўцы ня могуць вытрымаць старых. а цэны і безработцьце растуць. Але аб гэтым у наступны раз.

**N.**

Ля самае ваколіцы ўжо зноў пачалі спатыкацца паны і ізноў намаўляць і падсоўваць свае сьпіскі...

Гаспадыня ксяндзоўская ўсё нешта шаптала з нашымі бабамі...

Быў і Лявон ад абшарніка... Казаў, што ўжо ёсьць прыгатаваны дазвол на лес і, як толькі скончацца выбары, і пан пападзе ў Сойм, дык ня толькі, гэны лес, але на радасьцях яшчэ і насеньня дасьць...

Хлапцы маўчком слухаюць і на'т не жартуюць... Усе сур'ёзныя... І толькі свайго прадстаўніка спаткалі неяк радасна і падміргануўшы паказалі на кішаню, быццам кажучы:

— Ня бойся, браток! Ня выдадзім і не падвядзём!..

І ён уцяміўшы наш настрой бліснуў весяла вачыма і ад'ехаў далей...

У мястэчку ўжо да нас нікога не дапушчалі... Наш паліцыянт толькі аб'ехаў усе нашыя вазы...

— Pamiętajcie, psia krew! Żeby żadnej mniejszości?!.

Выбары адбыліся спакойна, і ўсе нашыя падалі за № 16...

1923 году... Зачынілі нашую беларускую школу... Хадзілі хлопцы жаліцца да войта...

— „Шаснастку" сваю маеце — кажа — дык і зварачвайцеся туды...

Тэлеграфавалі ў Сойм... Паслы злажылі „інтэрпэляцыю"...

1924 год... Ад падаткаў стогн ідзе... Усе школы зачынены... Тэлеграфавалі ў Сойм... Паслы злажылі „інтэрпэляцыю"...

1925 год... Складалі дэклярацыі аб беларускай школе, але яны недзе згінулі... Пісалі ў Школьную Раду, у „Прасьвету"... Ізноў тэлеграфавалі ў Сойм... Паслы злажылі „інтэрпэляцыю"..

Зіма 1925 году... Язэп і Міхась езьдзілі ў Вільню жаліцца на цяжкае жыцьцё... Як вярнуліся, дык іх заарыштавалі...

Тэлеграфавалі ў Сойм... Паслы злажылі „інтэрпэляцыю"...

1926 год.. Ізноў складалі дэклярацыі... ізноў стагналі ад падаткаў, арыштаў.. езьдзілі жаліцца, але ўжо не тэлеграфавалі ў Сойм, а ўсе павалілі запісвацца ў „Грамаду"...

*Г—ка.*

*Канец.*

## Сьмерць прэзыдэнта Латвіі.



Нядаўна памёршы першы прэзыдэнт Латвіі — Чакстэ.

# Апошнія навіны.

## У Польшчы.

ІМЯНІНЫ МАРШАЛКА ПІЛСУДСКАГА. У дзень імянін марш. Язэпа Пілсудскага, прыпадаючых на суботу 19 сакавіка, па ўсей Польшчы адбыліся ўрачыстасьці і вайсковыя парады.

СПРАВА ЗЬМЕНЫ ВЫБАРНАГА ЗАКОНУ. Канстытуцыйная Камісія Сойму далей працуе над зьменай выбарнага закону (ардынацыі выборчай). Калі выясьнілася, што ў гэтай справе правіца і левіца да паразуменьня не дайдуць, умяшаўся марш. Сойму Ратай, які крыху залагодзіў агульнае напружаньне.

Пасол Гломбінскі запрапанаваў утварыць на ўкраінскіх і беларускіх землях толькі 6 выбарных вакругоў (кожнае ваяводзтва — 1 вокруг), а галасаваньне адбывалася-б такім чынам, што галасуючы меў-бы права галасаваць толькі на трох кандыдатаў.

МАГЧЫМАСЬЦЬ РАСКОЛУ ў ПАРТЫІ „ПЯСТ". Две варшаўскія газэты „Epoka" і „Głos Prawdy" падалі вестку, што галоўны ўрад партыі „Пяст" атрымаў ад групы інтэлігэнцыі, якая належыць да гэтае партыі, пісьмо, падпісанае радам выдатнейшых сябраў гэтае партыі ў Варшаве, заклікаючае „Пяст" не стаяць ў апазыцыі да Ураду марш. Пілсудскага.

АДНАЎЛЕНЬНЕ ГАНДЛЕВЫХ ПЕРАГАВОРАЎ З НЯМЕЧЧЫНАЙ. Вярнуўся да Варшавы нямецкі пасол Раўшэр. Пасол Раўшэр мае інструкцыі і на падставе паразуменьня міністра замежных справаў Залескага з Штрэзэманам — распачне перарваныя гандлёвыя перагаворы

УКРАІНСКІ ПАСОЛ ВАСЫЛЬЧУК ВЫКЛЮЧАНЫ З ПАРТЫІ СЕЛЬРОБАУ. „Новый Час" падае, што Ц. К. Сельроба выключыў пасла Васыльчука з гэтае партыі. Прычынай гэтага было „петлюраўскае" становішча Васыльчука. Пасол Васыльчук разглядаў справы з нацыянальнага пункту гледжаньня.

Зьяўляецца магчымым і далейшы развал сельробаўскае партыі.

КАНЕЦ ЗАБАСТОЎКІ ў ЛОДЗІ. Работніцкія саюзы абвесьцілі адозву да работнікаў, што з прычыны прыняцьця ўрадовага арбітражу, з панядзелка 21 сакавіка трэба прыступаць да працы.

ПАВАРОТ ПОЛЬСКІХ ПАСЛОЎ З ФРАНЦЫІ. Вярнулася з Францыі група польскіх парлямэнтарыстаў. Пабывала гэтая група амаль ува ўсіх вялікшых гарадох Францыі.

ГАНДЛЕВЫ ТРАКТАТ З ГІШПАНІЯЙ. У сувязі з выездам новага польскага пасла да Мадрыду — робяцца прыгатаваньні для распачацьця польска гішпанскіх гандлёвых перагавораў з мэтай заключэньня дагавору. Узамен за атрыманьне мытных зьніжак на рад польскіх тавараў, якія вывозяцца да Гішпаніі, Польшча прызнае зніжку таварам гішпанскім, пры чым будзе акрэсьлена сума, на якую будзе прывезена і вывезена тавараў.

## За граніцай.

ВЫБАРЫ ПРЭЗЫДЭНТА ў Латвіі. Пры выбарах на прэзыдэнта вялікую ролю могуць адыграць галасы нацыянальных меншасьцяў, бо правае крыло Сойму мае замер аб'еднаць усе антысацыялістычныя групы, выстаўляючы супольнага кандыдата. Найбольш шансаў быць выбраным прэзыдэнтам мае старшыня сялянскага саюзу Паўлюк.

ДЫНАСТЫЧНЫ САЮЗ ПАМІЖ ІТАЛІЯЙ і РУМЫНІЯй. У Рыме абгаварываецца справа магчымасьці заключэньня саюзу італьянска-румынскага. Праэктуецца жаніцьба княжны Іліяны з італьянскім наступнікам трону Гумбэртам.

ФІНСКІЯ САЦЫЯЛІСТЫ ПРОЦІЎ ДАГАВОРУ з С.С.Р.Р. У сувязі з перагаворамі, якія вядуцца ў Рэвалі паміж Эстоніяй і Саветамі ў справе дагавору аб ненападаньні, сярод фінскіх сацыял-дэмакратаў пераважае апінія, што латвійскія сацыялісты прычыняючыся да заключэньня дагавору аб ненападаньні з Радавай Расеяй, — пасунуліся задалёка Гэты дагавор аслабляе значэньне Лігі Народаў. Сацыялісты фінскія падтрымалі-бы дагавор з С.С.Р.Р. толькі тады, калі-б гэтым можна было-б прычыніцца да ўзмацненьня аўтарытэту Лігі Народаў, што па іх думцы ляжыць у інтарэсе сусьветнае дэмакратыі асабліва ў інтарэсе малых народаў. У Фінляндыі ня трэба чакаць распачацьця перагавораў з С.С.Р.Р.

ПРАТЭСТ САВЕЦКАГА ЎРАДУ ПРОЦІ ПРЫЗНАНЬНЯ ІТАЛІЯЙ БЭСАРАБСКАЙ ГРАНІЦЫ. Савецкі Урад, за пасярэдніцтвам свэёй амбасады ў Рыме, злажыў у міністэрстве заграничных справаў пратэстацыйную ноту проці ратыфікацыі Італіяй парыжскага дагавору з 1920 году ў справе прыналежнасьці Бэсарабіі да Румыніі.

ТРОЦКІ ПАСЛОМ ў КОЎНІ. Разыйшлася ў Коўні вестка, што Троцкі, які зусім пагадзіўся са Сталіным, мае атрымаць дыпляматычнае становішча за граніцай і праўдападобна будзе вызначаны паслом да Коўні.

ХМАРЫ НА БАЛКАНАХ. Занадта агрэсыўнай палітыкай Італіі адносна Албаніі вельмі занепакоена Югаславія. Раней Албанія была амаль зусім незалежнай дзяржавай, а цяпер аканчальна апынулася пад уплывамі Італіі, што вельмі некарысна і небясьпечна для Югаславіі. Канфлікт паміж Італіяй і Югаславіяй прыняў асабліва востструю форму. цяпер Кажуць нават аб аружнай спатычцы.

ГРЭЦЫІ ПАГРАЖАЕ НОВЫ ПЕРАВАРОТ. У грэцкіх вайсковых колах пануе вялікае незадаваленьне ўрадам. Незадаваленьне выклікана дэкрэтам ураду аб звальненьнях сярод каманднага складу. Кажуць, што гэн. Канділіс, які стаіць на чале апазыцыянэраў — мае замер у бліжэйшай будучыні скінуць істнуючы ўрад і аб'явіць сябе дыктатарам Грэцыі.

СПРАВА ПАВАРОТУ ЭКСКАЙЗЭРА ДА НЯМЕЧЧЫНЫ. У рэйхстагу пасол Бэгман, ад імя партыяў цэнтру, сказаў — што паварот Вільгэльма на бацькаўшчыну ня можа пашкодзіць рэспубліканскаму ладу Нямеччыны. Наадварот — паварот Вільгэльма меў бы вялікае палітычнае значэньне.

# Тутэйшая хроніка.

**У справе прызыву радзіўшыхся ў 1898 годзе** Разам з прыняцьцем у войска другой групы радзіўшыхся ў 1905 годзе, будуць прымушаны адбыць службу таксама мужчыны, якія радзіліся ў 1898 годзе, якія па якім небудзь прычынам не адбылі вайсковае службы дагэтуль.

**Зьмена віц-рэдактара.** Адказны рэдактар „Narodnaha Zwona" з нейкае прычыны зрокся свайго „ганаровага" становішча Ягонае мейсца заняў нейкі Казімір Хамяк.

**Забастоўка шаўцоў** Ужо некалькі дзён трывае ў Вільні забастоўка шаўцоў.

17 сакавіка ўвечары 15 бастуючых шаўцоў напалі на кватэру свайго калегі Клебанскага, які не прылучыўся да забастоўкі Аднак Клебанскі разам з іншымі шаўцамі ня толькі не былі набітыя, але самі перайшлі ў наступленьне і прагналі нападаючых. Але праз 2 гадзіны зьявілася 50 бастуючых, якія пачалі ламаць дзьверы. Клебанскому ўдалося ўцячы праз вакно.

Прыбыўшая паліцыя арыштавала 19 чалавек.

**Шалёны воўк.** 16 сакавіка ў в. Рудня, Каняўскае гм., зьявіўся шалёны воўк, які пакусаў 4 асобы. Гэты-ж воўк у той-жа дзень у суседняй вёсцы Кашэты пакалечыў 5 асоб. Гадзінай пазьней у в. Балтуп'е ахвярамі ваўка аказалася 4 асобы.

Усяго разам у адзін дзень воўк пакалечыў 16 асоб. Апрача таго пакусаў шмат сабак і скаціны. Улада даведаўшыся аб ваўку выдала адпаведнае распараджэньне. Была зроблена аблава і ваўка забілі.

**Канфіската жыдоўскае газэты.** Камісар Ураду наложыў арышт на N 69 часопісі ў жыдоўскай мове „Тог" за артыкул у якім бароняцца Н.П.Х. і Грамада.

## Пісьмо у рэдакцыю.

*Паважаны Пане Рэдактар!*

Прашу абвесьціць у Вашай газэце наступнае:

Многія робяць мне закіды, быццам я належу да Грамады, — дык сьцьверджаю, што знаючы антыдзяржаўную і комуністычную дзеяльнасьць гэтай партыі ніколі я да яе не належыў і ніякіх адносінаў нават з грамадоўцамі ня меў

З пашанай Кастусь Кошко.

11. III. 27 г.

в. Страла, гм. Дзятлаўскай пав. Навагрудзкі.

## Кідаюць Грамаду.

На імя старшыні Беларускай Нацыянальнай Рады п Паўлюкевіча паступіла гэткая заява:

**Паважаны Пане Старшыня!**

Пераканаўшыся ў тым, што Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада — партыя комуністычная, — выходзім з яе.

Папалі мы да яе праз ашуканства і толькі пасьля арыштаў даведаліся, што гэтая партыя антыдзяржаўная.

Яшчэ ў 1920 годзе, калі бальшавікі былі тут — яны разграбілі нашыя гаспадаркі. Ня хочам, каб гэта ізноў паўтарылася.

Заклікаем іншых беларускіх сялян зрабіць тое самое і пакінуць Грамаду.

Няхай жыве Беларуская Нацыянальная Рада, якая сапраўды, легальным шляхам, — бароніць нашых правоў!

*Драгун Якуб.*
*Драгун Аляксандар.*
*Астапчэня Васіль.*

в. Мяшотнікі, Лунінскае гм. Горадзенскага пав.

15 сакавіка 1927 г.

## Жыцьце провінцыі.

### Патрыёты.

(*Жыдамлянская гм. Горадзенскага пав.*)

У свой час у грамадаўскай шмаце „Народнай Справе" была зьмешчана карэспандэнцыя з Жыдамлянскай гм., у якой надта лаялі нібыта антыграмадаўцаў — Рыгора Казла, Піліпа Мышко, Пятра Аутко, а таксама ўмяшалі К. Сухоцкага і войта Быльчынскага Аднак цяпер ходзяць чуткі, быцца вышэй памянёныя панкі, апрача Сухоцкага і Быльчынскага, самі на сябе напісалі, каб быць даверанымі асобамі ўлады. Гэтыя самыя панкі, калі была нядаўна прылеплена адозва Беларускай Нацыянальнай Рады ў в. Савалёўцы, і калі яны пракаваліся, што гэтая адозва скіравана проці Грамады, — дык зараз-жа зьдзёрлі.

Дык вось, „як ваўка ні кармі, а ён усё ў лес глядзіць",—сваім паступкам яны выказываюць свой фальшывы патрыятызм. Памянёныя панкі, маючы за сабой вялікія грахі, стараліся прыкідвацца вернымі ўладзе, каб быць спакойнымі за прошлае. У 1920 годзе, у часе бальшавікоў гэтыя „птушкі" займалі „адпаведныя становішчы": П. Мышко быў продкомам і забіраў з наганам у руках, — апошнія кароўкі, Рыгор Казёл прэдрэвкомам і П. Аутка—яго памоцнік, якія аддалі чэкістам пад палявы суд жыхара в. Савалёўкі—Макара Калюту, які будучы забраным сілай у чырвоную армію, уцёк з апошняй і хаваўся дома,—даведаўшыся аб гэтым яны зараз-жа яго арыштавалі.

Гэтыя тайныя прыхільнікі комунізму яшчэ і цяпер успамінаюць 20 год, і вераць, што ён прыдзе ізноў. Ведама гэтага чакаюць усе зладзеі, бандыты і іншыя цёмныя асобы, якім патрэбна рэвалюцыя — каб паграбіць. Казёл і Аутка яшчэ да вайны займаліся зладзействамі. Казёл краў што папала — па грамадаўскі. У 1918 годзе ён украў апошняю кароўку ў в. Курпікі ў аднае беднае ўдавы і закелзаўшы круцялём трымаў ў каморы і толькі дзякуючы нямецкім жандармам — якія гэтай каровы шукалі ў цэлай вёсцы, і баючыся каб яе не знайшлі, за што немцы зрабілі-б—як кажуць „капут"—Казёл карову выпусьціў. А Аўтка дык у свайго бацькі ўкраў пару коні.

Дык вось гэткія тыпы і стараюцца перашкаджаць нацыянальнай працы, будучы зладзейска комуністычнага праканаьньня,—на што ёсьць факты: яшчэ вясной 26 году сын Аўткі—Васіль, як бачылі пастушкі, раскідаў на выгане комуністычныя адозвы, а другі яго сын — у Расеі камісарам.

*Чудзіла.*

### Сялянскія ашуканцы.

(*Горадзенскі павет*)

Грамадаўцы з в. Паніжане Лунінскае гміны кралі лес, які прадавалі на гарэлку; аднэй ночы лясьнік Мікуліч праходзячы заўважыў злодзеяў, якія доўга не чакаючы па бальшавіцку „канфіскавалі" ў Мікуліча душу сякерай! Чаму-ж аб гэтым маўчыць грамадаўская газэта? А чаму яна зьмешчае розную выдуманую брахню! Неяк прыпадкова, будучы ў Рэўках, адзін паказвае мне газэту Грамады і просіць, каб я яму даў сваю „Б. Слова". Я згодзіўся .. аж чытаю... і сам сабе ня веру... што за ліха! Гэта-ж я сам селянін быў на зьезьдзе ў Горадні! А тут чаго яны ня выдумалі са злосьці!

Добра, што сяляне не надта ім вераць і многія зразумелі іхнюю здрадніцкую для беларусаў работу і гоняць вон платных грамадаўскіх агэнтаў. Селянін на брахню грамадаўскіх газэт увагі больш не зьвяртае, бо ведае, што Грамада апрача сялянам вастрогу, а платным агэнтам далярчыкаў — нічога ня дасьць, а толькі корміць абяцанкамі.

Між іншым і аб працы грамадаўцаў на мясцох. У в. Савалеўцы цяпер ні праехаць, ні прайсьці—балота кругом. Праўда тут вінаваты папярэднія солтысы, але таксама і грамадаўцы, якія зьбіралі грошы, і замест пастроіць мост і паправіць дарогі — купілі чырвоную плахту „штандар", а рэшту прапілі.

*Курыла.*

### Яшчэ у справе брахні грамадаускае газэты.

(*Пісьмо ў рэдакцыю*).

У N 11 ад 28 лютага ў вядомай па сваёй сымпатыі да бальшавіцкага чырвонага раю газэце „Наш Голас", зьмешчана карэспандэнцыя з Баранавіч, аб адбыўшэйся тамака канфэрэнцыі Беларускай Нацыянальнай Рады 8 і 9 лютага г. г. Чаго толькі ў гэтай ілжывай карэспандэнцыі нехта не напісаў?!

Паводле яго тлумачэньня ў Баранавічах ніякой канфэрэнцыі ня было. У Баранавічах затрымаўся часова, едучы з Вільні ў Нясьвіж, п Паўлюкевіч і яшчэ пяць асоб, якіх ён вёз на гэтую канфэрэнцыю У Баранавічах да іх прылучылася яшчэ 2 асобы і яны ў малым пакоіку ў гатэлю склалі рэзалюцыі Вось і ўся канфэрэнцыя! Далей пісака з Баранавіч сумуе ад таго вялікага ўражаньня, якім карыстаецца ў польскай прэсе адбыўшаяся канфэрэнцыя Беларускай Нацыянальнай Рады.

Прачытаўшы гэтую ілжывую карэспандэнцыю шмат каму будзе здавацца, што ўсё ў сапраўднасьці гэтак і было!

Я як чынны вучасьнік канфэрэнцыі мушу катэгарычна сцьвердзіць, што ўсё вышэй напісанае аб канфэрэнцыі ёсьць мана і ашуканства. Перш наперш на канфэрэнцыі было з Вільні толькі 2 асобы: старшыня Б. Н. Рады п. Паўлюкевіч і рэдактар „Беларускага Слова" п. Т. Вернікоўскі. Усіх жа дэлегатаў было ня восем, але дзевятнадцать з усіх паветаў Навагрудчыны. Сярод дэлегатаў было шмат і гэтакіх, якія ўжо доўгі час працавалі на карысьць нашай Бацькаўшчыны. На канфэрэнцыі спачатку былі прамовы нашых арганізатараў, потым даклады дэлегатоў з паасобных паветаў, далей адбывалася дыскусія і толькі тагды нарэшце былі апрацаваны рэзалюцыі, якія і былі прыняты ўсімі прысутнымі. На канфэрэнцыі панаваў сапраўдны беларускі настрой і любоў да сваёй Бацькаўшчыны—Беларусі.

Баранавіцкая канфэрэнцыя яскрава паказала, што ўплывы Беларускай Нацыянальнай Рады з кожным днём усё больш растуць!. Баранавіцкая канфэрэнцыя мае вялікае значэньне як этап да хутчэйшага дасягненьня нацыянальна-дэмакратычнай праграмы Б. Н Р., потым яна паказала чаго жадае Беларускі Народ ад сучаснага Ураду Польскай Дзяржавы, і нарэшце выявіла запраўдную ролю „Грамады", якая як усім вядома разьбівае агульна нацыянальны беларускі фронт. Дык вось, як ў сапраўднасьці адбывалася Баранавіцкая канфэрэнцыя! Але гэтага ўсяго ня ведае карэспандэнт з Баранавіч газэціны „Наш Голас" ілжэ колькі хоча! Яму здаецца, што папера павінна цярпець усю яго, незгодную з праўдаю, брахню,—дык ён перакручывае ўсю сапраўдную абстаноўку, каб толькі атрымаць падзяку ад таямнічага галоўнага рэдактара „Нашага Голасу". І застаецца толькі шкадаваць, што яшчэ ёсьць людзі, якім гэтыя вялікія словы, як сумленьне і чыстая праўда мала што кажуць іх розуму і сэрцу!... Па іх думцы, калі пішаш альбо гаворыш супроць праціўніка, дык можаш мяшаць праўду з няпраўдай, каб толькі дапяць сваей мэты

Напісаў усё гэта, каб папярэдзіць чытачоў газэты „Наш Голас" і наагул усё беларускае грамадзянства, якія ілжывыя карэспандэнцыі на сваіх шпальтах зьмяшчае орган „Грамады".

*Дэлегат ад Лідзкага павету і Лідзкае „Прасьветы" Кастусь Маеўскі.*

## Новыя грошы.



Выйшлі новыя 10-х залатовыя банкноты. На фатаграфіі адна старана новае 10 х залатоўкі.

## Слонімская хроніка.

Пасьля ліквідацыі Грамады — ўся „праца на тэрыторыі Слонімшчыны пайшла ў падпольле. — Цяпер „працуюць" толькі комуністы — а хто яны? Быўшыя старшыні гурткоў. Цяпер і сьляпому адчыніліся вочы, што Грамада была і ёсьць чыста комуністычнай арганізацыяй з прымешкай... ўгалоўнабандыцкага элемэнту (глядзі фатаграфіі гурткоўцаў), які хоча крывавай рэвалюцыі, каб можна было грабіць і гуляць...

А хто гэтага хоча? Толькі тыя тыпы, якія добра грабілі ў Расеі і пад гукі гармоніі стралялі нявінным ахвярам ў галовы.

Вялікшая частка паважных беларускіх грамадзян ня імкнецца да крывавай рэвалюцыі — а толькі цьвёрда хоча зямлі, школы і роўных правоў!

Звальненьне інсп. самаўр. слонімск. — Шчэпанскага — стаіць ў сувязі з хабарнай афэрай гмін. пісарчука—Зарнавіна з Чамераў.

На Слонімскі павет з пазычкі земляробскай выйшла доля .. 65.000 зл Пазыкі на пасеў дае „Wydział Powiatowy" ад 50 зл. да 200 зл. прац. ад гэтага ёсьць 5.

Трэба звярнуць пазычкі 1. II. 28 г.

Разумнейшыя сяляне, бачучы, што Грамада ёсьць чыста комуністычнай арганізацыяй, масова тутака дзяруць білеты сяброўскія. Нікому не дадзём білетаў, — падзярэм у кавалкі і канец „Грамадзе" — так кажуць б. сябры Грамады ..

Тодар Ліхач з Вострава, Слонімск. пав. так горача ўзяў да сэрца палітыку „гурткоўцаў, што адрокся ад вучыцельскай працы і пэнсіі. Цікавы факт! Цяпер мае дастаць мандат арганізацыі лейб-гвардыі ахраны Луцкевіча!

Віншуем таварыша камандзіра! А гарматы, таварыш мае?!

Ведамы „грамадаўскі дзеяч",—Масьцерка з в. Нікалаеўшчына, кінуў „Наш Голас", а чытае толькі: „Przedjutze", „Jutrzenka" і др. варшаўскія газэткі Варшаўскія загаркі, газэты і галіфэ" таварышы любяць. . Чаму так?

## Усячына.

### Чаму птушкі адлятаюць на зіму.

Над гэтым думала ўжо шмат вучоных людзей. Яны доўга прыглядаліся жыцьцю птушак у часе адлёту, пасьля і перад ім, і усё-ж не здалелі згадаць, што гоніць птушак у так далёкую падарожу. Вучоныя думаюць, што апрача страху перад сьцюжай і нястачай пожыву ўзімку, ёсьць яшчэ нейкая іншая прычына, якая цягне птушак у падарожу. Гэта нешта таемнае, бо прыкладам маладыя птушкі, каторыя ў нас вывяліся і ня ведаюць адлётаў, добра ведаюць і час і дарогу адлёту. Адна нямецкая газэта гэтак піша пра адлёт птушак: Паасобныя птушкі ляцяць на вышыні 100 мэтраў над зямлёй, а грамады ляцяць на вышыні да 1000 мэтраў. Дарогу выбіраюць не карацейшую, часта непатрэбна кружацца і вельмі ніколі не сьпяшаюцца. Наагул у дзень пралятаюць каля 150 кілёмэтраў Найдалей і найскарэй ляцяць ластаўкі.

Вучоныя і далей робяць досьледы над гэтай цікавай справай.

### Леў у ложку.

З аднаго цырку пад Парыжам уцякла львіца. Уцякаючы перад старажамі забегла яна да аднаго каланіяльнага магазыну, нарабіла там шкоды, а потым сходамі пабегла да ўласьніка магазыну, які ў гэты час ляжаў у ложку. Львіца доўга ня думаючы улезла да ложка і палажылася каля сьпячага купца. Была яна, відаць, зусім асвоена, бо палажыла галаву на грудзі сьпячага і не зрабіла яму нічога благога. Можна сабе прадставіць перапуд купца, калі той прасну ўшыся пабачыў каля сябе гэткую „мілую" таварышку.

Хутка прыйшоўшыя старажы забралі львіцу.

## Савецкі гумар.

### „Сьмелы"...

— Люблю я чысьціць начальства!

— На сходзе?

— Не, па большай часьці ў прыхожай — пацісьнеш штотку і пачысьціш! Цяпер жа швэйцараў німа.

### Па вялікім заветам.

— Ты ж сам кажаш, што жаніцца на мне—твой доўг.

— Доўг -- дык доўг, але даўгі ўсе цяпер анупяваны.

### Пастаянныя працэсы.

— У мяне, доктар, працэс у лёгкіх.

— Гэта што! У мяне вось працэс у губэрнскім судзе!

### У глухой провінцыі.

— Я, даражэнькі, пуд солі купіў...

— На што-ж гэта?

— А вось учора па радыё чуў: „У яе выпаўненьні не хапае солі".

## Паштовая скрынка.

*Шымаоўскі Аляксандар* — газэту і іншае высылаем. Пішыце карэспандэнцыі аб Вашым і Вашае вёскі жыцьці.

*Станевіч Барые* — адказ вышлем пісьмом.

*Батура Макар* — Вам таксама высылаецца пісьмо.

*Варановіч Пётра* — высылаем Вам газэту ад пачатку сакавіка. Палітычным вязьням газэта высылаецца бясплатна.

*Хмелеўскі Пётра* — ня можам ручацца, што Вы акуратна будзеце атрымліваць „Беларускае Слова", бо німа ад Вас падпіскі.

Данілевіч Ст., Пятроўскі М., Барташук, Філімон Славінскі М.,—газэту высылаем.

*Юрцы з пад Слоніма*, з Вашых карэспандэнцый карыстаем. Прысылайце больш.

*М. Д з Глыбокага* — з прысланае карэспандэнцыі скарыстаць ня можам. Іншым разам пішыце чарнілам.

*Чудзіла* — з прысланага скарыстаем.

Дзямід Язэп, Дроцько Наталья, Жук Мар'я, Каракулька Янка, Каракулька Язэп, Каракулька Аляксандар, Каракулька Аляксандра, Гульнік Язэп, Гульнік Янка, Буйка Мікола, Касьцюшка Лукаш, Касьцюшка Мар'я, Верабей Ганна, Балькоўскі Вінцук, Палейко Грыгор, Крупіца Вінцук, Шкулепа Янка, Сьняжыцкі Аляксандар, Скробка Янка — *усім пробныя нумары „Беларускага Слова" высылаюцца.*

*Атрымана:*—ад Кандрацюка Антона, Еленскага А. Мяшотнікава М, — па 5 зл., ад Крэнця Язэпа, Кульбакі, Шыранскага Сяргея, Пігаля — па 2 зл., ад Кулакоўскага 1 зл.



Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. Пасьпешная, Вільня Біскупья 12. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.